Весці БДПУ. Серыя 1. 2019. № 1. С. 118–123

УДК 821.161.3 Л. Рублеўская

# ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫ ДЫЯПАЗОН ПРОЗЫ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА

**М. С. Рак,**
*аспірант кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 18.01.19.

UDC 821.161.3 L. Rubleuskaya

# GENRE AND THEMATIC RANGE OF THE PROSE BY LYUDMILA RUBEVSKAYA: TRADITINS AND INNOVATION

**M. Rak,**
*Postgraduate Student of the Department of Belarusian and Foreign Literature, BSPU*

Received on 18.01.19.

У артыкуле на матэрыяле прозы Людмілы Рублеўскай (аповесці «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара», «Ноч на Плябанскіх Млынах», навелы «Старасвецкія міфы горада Б*», раманы «Золата забытых магіл», «Скокі смерці», «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію», «Сутарэнні Ромула», «Дагератып» «Пантофлі Мнемазіны») вызначаецца жанрава-тэматычная спецыфіка і акрэсліваецца адметнасць аўтарскай рэпрэзентацыі гісторыі ў аспекце традыцый і наватарства.

*Ключавыя словы:* жанравы сінкрэтызм, гістарычная проза, міфалагічная навела, «шляхецкае апавяданне», дэтэктыў, гатычны раман, містычная аповесць, раман-інструкцыя, раман-лабірынт, дэкадансны раман, раман-фанфік, паралельны хранатоп.

The article which is based on the material of prose by Ludmila Rublevskaya (the novels “The heart of a marble angel”, “The ring of the last emperor”, “The night at the Plebanian's Miils”, “The Old myths of town B*”, “The gold of forgotten graves”, “The dance of death”, “To kill the villain or the Albarutenia Game”, “Romul's dungeons”, “Daguerreotype”, “Mnemosyne's shoes") defines the genre and thematic specificity and outlines the originality of the author's representation of the history in the aspect of tradition and innovation.

*Keywords*: genre syncretism, historical prose, mythological novel,”the noble stories”, detective, gothic novel, the mystical story, novel instruction, maze novel, decadence novel, fanfiction novel, parallel chronotope.

Адзнакі плённага пошуку ў рэчышчы тэматычнага і жанравага «поліфанізму» выявіліся ў творчасці Людмілы Рублеўскай, дзякуючы якой нацыянальная гістарычная проза апошніх дзесяцігоддзяў стала яскравым прыкладам жанравай дыфузнасці і разамкнёнасці. Варта адзначыць яшчэ і тое, што ў апавяданнях, аповесцях і раманах пісьменніцы нават сама «гісторыя» і «сучаснасць» знаходзяцца ў надзвычай цікавых стасунках: так, вызначальнай рысай многіх твораў стала мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі, якая заўсёды / амаль заўсёды перапляятаецца з сучаснасцю, выкарыстоўваецца паралельны хранатоп, двухсветавасць (а часам і шматсветавасць) як асноўныя прынцыпы арганізацыі тэкставай прасторы. Паралельны хранатоп многіх твораў пісьменніцы дазваляе зрабіць «падсветку» цяперашняга былым, вызначыць вытокі напружаных калізій, абгрунтаваць тым самым глыбокую еднасць і ўзаемазвязанасць / узаемаабумоўленасць дня сённяшняга і аддаленых у часе падзей, рамантызаваць «сівую даўніну», адкрыць яе для шырокага кола аматараў, нават пэўным чынам белетрызаваць, але белетрызаваць па-караткевічаўску, таленавіта і годна. Акрамя названых вышэй фактараў, на жанравую дыфузію прозы пісьменніцы ўплываюць і ўзаемаадносіны / узаемастасункі двух светаў – рэальнага і таямнічага, містычнага. У падобным ракурсе «варта гаварыць пра актуалізацыю традыцый рэнесанснай навелістыкі, еўрапейскага і беларускага рамантызму з выразна асветніцкімі мэтамі» [1, с. 31].

Праблемна-тэматычны дыяпазон прозы Л. Рублеўскай поліфанічны: пацягваючы рамантычныя традыцыі літаратуры XIX стагоддзя ў цыкле «Шляхецкія апавяданні» (1996–2002)[1], пісьменніца ўздымае праблемы годнасці чалавека; у містычных дэтэктыве «Дзеці гамункулуса» (1999) і аповесці «Ночы на Плябанскіх Млынах» (2006) апісанне падзей нязмушана прыводзіць

[1] Тут і далей у дужках падаюцца даты напісання твораў.

Репозиторий БГПУ

чытача да асэнсавання маральна-этычнай праблемы: як застацца чалавекам у любых, нават самых складаных, абставінах; сучаснасць пераплятаецца з даўніной і пацвярджае тэзіс пра адказнасць кожнага пакалення і за мінулае, і за будучыню ў аповесцях «Сэрца мармуровага анёла» (2000), «Пярсцёнак апошняга імператара» (2001) і раманах «Золата забытых магіл» (2003), «Скокі смерці» (2005); у раманах «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію» (2007) і «Сутарэнні Ромула» (2009–2010) асэнсоўваецца тэма сталінскіх рэпрэсій; пенталогія пра Пранціша Вырвіча (2011–2018) адлюстроўвае перыпетыі XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай з дапамогай прыгод і фантасмагорыі; у рамане «Дагерагатып» (2014) узнаўляюцца перадрэвалюцыйныя падзеі канца XIX стагоддзя, а ў «Пантофлях Мнемазіны» (2016) праз форму фанфіка пісьменніца зноў звяртаецца да асэнсавання тэмы сталінскіх рэпрэсій.

У творчасці Л. Рублеўскай спалучаюцца разнастайныя стылёвыя плыні і кірункі (імпрэсіянізм, неарамантызм, натуралізм, рэалізм, постмадэрнізм і інш.), а яе жанравы поліфанізм – сведчанне эвалюцыі спосабаў адлюстравання гістарычнай тэмы ў нацыянальнай літаратуры, якая прадстаўлена наступнымі жанрамі і міжжанравымі ўтварэннямі: міфічнымі / міфалагічнымі навеламі, «шляхецкімі апавяданнямі», дэтэктыўнымі аповесцямі, пабудаванымі па прынцыпе «двухсветавасці», гатычным раманам, містычнай аповесцю, раманам-інструкцыяй, раманам-лабірынтам, дэкадансным раманам, раманам-фанфікам і інш. Варта адзначыць, што сама пісьменніца дае ім сутнасна-характарыстычныя найменні: «Старасвецкія міфы горада Б*» – *міфічныя навелы,* «Шляхецкія апавяданні» – *аднайменнае вызначэнне жанру*, «Дзеці гамункулуса» – *містычны дэтэктыў*, «Ночы на Плябанскіх Млынах» – *містычная аповесць*, «Золата забытых магіл» – *паралельны раман*, «Скокі смерці» – *гатычны раман*, «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію» – раман-інструкцыя, «Сутарэнні Ромула» – раман-лабірынт, «Дагератып» – дэкадансны раман, «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», «Авантуры студыёзуса Вырвіча», «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча», «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра здрадніка і канфедэрата», «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага Доктара» – *прыгодніцка-фантасмагарычныя раманы*. Раскрыем сутнасць падобных дэфініцый.

*Міфічныя навелы* – невялікія эпічныя творы з дынамічным сюжэтам, пабудаваныя на апісанні выключнай / незвычайнай падзеі, арыгінальная спроба трансплантацыі на нацыянальную глебу грэчаскіх міфалагічных сюжэтаў. Аповеды пісьменніцы носяць назвы арыгінальных міфаў («Артэміда і Актэон», «Апалон і Марсій», «Арфей і Эўрыдыка», «Скрыня Пандоры», «Нарцыс і Рэха» і інш.), а іх змест сцісла прадстаўлены ў анатацыях. Такім чынам, вядомыя міфалагічныя сітуацыі трансфармуюцца ў паўсядзённым жыцці жыхароў правінцыяльнага горада Б*, а іх удзельнікамі становяцца не багі і героі, а звычайныя гараджане: сын уладарніка піваварні і «пакутны» жаніх Стась Гарбузік («Арфей і Эўрыдыка»); пятуценная незамужняя панна Канстанцыя («Артэміда і Актэон»); таленавіты музыка-самародак Гірша («Апалон і Марсій») і інш. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што з героямі навел здараюцца незвычайна-выключныя выпадкі-метрэнгі, што здзіўляюць усіх гараджан і саміх герояў, але выключнасць і незвычайнасць хутка асімілюецца будзённасцю, і прывычна-звычайны і нетаропка-паўсядзённы жыццёвы ўклад жыцця горада Б* працягваецца.

*Шляхецкія апавяданні* – невялікія навелістычныя аповеды, заснаваныя на звароце да легендарна-гістарычнага мінулага Альбарутэніі – часоў пасля паўстання 1863 года. Творы атрымалі падобнае жанравае найменне не толькі па прычыне прыналежнасці герояў да шляхецкага саслоўя, але і таму, што «шляхецкі гонар», годнасць чалавека, здольнасць заставацца самім сабой у крытычных сітуацыях становяцца дамінантнымі праблемна-тэматычнымі матывамі цыкла. Паэтыка апавяданняў будуецца на бінарных апазіцыях «гонар і здрада», «воля і турма», «самаахвярнасць і страх», «помста і даравание», «памяць і забыццё» і інш. Да таго ж некаторыя творы («Хлебазоры», «Дом з драўлянымі львамі», «Экскурсавод», «Гайвароны») закранаюць пытанні павагі да гісторыі, мовы, культуры роднага краю: «Гісторыя ў кожнай нацыі крывавая. Веліч і злачынства заўсёды побач… і злачынства заўсёды больш… але трэба ведаць сваю гісторыю, менавіта сваю, і ганарыцца ёю. Паважаць самога сябе, сваю культуру, сваю мову» [2, с. 251], у некаторых – выяўляюцца

Рэпазіторый БДПУ

рысы містычнага, дзе жыццёва-рэальнае суіснуе са звышнатуральным («Лікантроп», «Экскурсавод»).

*Містычны дэтэктыў* і *містычная аповесць* – сюжэтна дынамічныя эпічныя творы, паэтыка якіх амаль цалкам пабудавана на спалучэнні «гісторыі росшуку» з містыкай. Таемна-загадкавая, амаль гатычная гісторыя пра гамункулуса ў «Дзецях гамункулуса» (гамункулус – істота, створаная алхімікамі, у прыватнасці чарнакніжнікам панам Твардоўскім у XVI стагоддзі (аналаг Франкенштэйн Мэры Шэлі)) перарастае ў асэнсаванне філасофскай і маральна-этычнай праблемы: як застацца чалавекам, не ператварыцца ў «робата, аўтамат з адзіным інстынктам – самазахавання» [3, с. 43–44]. У аповесці «Ночы на Плябанскіх Млынах» спалучаюцца элементы таемнага, незвычайнага, містычнага, готыкі і міфалогіі. Хранатоп твора лакальны: дзеянне адбываецца падчас рэвалюцыі ў старасвецкім доме ля Плябанскіх Млыноў, які апынуўся пасярод воднай стыхіі ў выніку паводкі на Свіслачы і Нямізе. Пазнавальнай у творы з'яўляецца рэканструкцыя-рэцэпцыя выбітных аповесцей XIX – пачатку XX і другой паловы XX стагоддзяў «Шляхціца Завальні…» Яна Баршчэўскага, «Лабірынтаў» Вацлава Ластоўскага і «Дзікага палявання караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча.

*Дэтэктыўныя аповесці* Л. Рублеўскай («Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара») з'яўляюцца прыкладамі жанравай паліфаніі, спалучаюць у межах аднаго тэксту адзнакі гістарычнага твора і белетрыстычных жанраў – дэтэктыва, прыгодніцкай і меладраматычнай аповесці. У іх аснове знаходзіцца «росшук таямніцы» і паралельны хранатоп (спалучэнне і перакрыжаванне сучаснасці з даўніной, яна нагадвае аб сабе праз атрыманыя ці выпадкова знойдзеныя рэчы, лісты, артэфакты, пачутыя гісторыі) і, па сутнасці, адыход ад «строгіх» гістарычных падзей і фактаў. Таемна-мройны, нерэалістычны, нават містычны каларыт і гісторыка-легендарны фон твораў заснаваны на выкарыстанні паданняў і легенд, што яшчэ раз падкрэслівае важнасць аўтарскай думкі пра прысутнасць гісторыі ў нашым жыцці, пра адказнасць кожнага пакалення і за мінулае, і за будучыню.

*Гатычны раман* – раман «жахаў і таямніц», дзеянне ў якім адбываецца ў вусцішнай напружанай атмасферы сярод закінутых замкаў, могілак, сутарэнняў, пабудаваны на паралельным хранатопе і снабачаннях, рэалістычнасць жа апісанняў і дэталяў побыту толькі падкрэслівае напружанасць аповеду ў творы. У гатычным рамане «Скокі смерці» Л. Рублеўская таксама выкарыстоўвае паралельны хранатоп як асноўны кампазіцыйны прынцып. Сам жанр гатычнага рамана, як абалонка, абраны пісьменніцай наўмысна: звяртаючыся да таямніц і загадак змрочнага былога, Л. Рублеўская імкнецца падкрэсліць сувязь мінуўшчыны і будучыні, паказаць, да чаго можа прывесці выкарыстанне звышзброі людзьмі, якія імкнуцца маніпуляваць і панаваць над іншымі. «Скокі смерці» становяцца раманам «жахаў і таямніц», разгадаць якія героям дапамагае не толькі апантанасць нацыянальнай гісторыяй, але і сны галоўнай гераіні, якія пераносяць чытача ў Сярэднявечча. Л. Рублеўская ідзе ўслед за жанравым канонам твора: яе раман заснаваны на фантастычным сюжэце (гадзіннікавых спраў майстар і лекар вялікага князя Гервасій Бернацоні вынайшаў у даўнія часы звышзброю, якая складаецца з 12 гадзіннікаў, здольную знішчаць чалавечую волю), дзеянне адбываецца ў незвычайных абставінах (ратуша, старажытны замак, закінутая мясцовасць, сутарэнні і г. д.), а рэалістычнасць у апісанні дэталяў побыту ставарае напружанасць аповеду. Варта адзначыць, што ў жанравай парадыгме рамана, паралельна з гатычнымі, выкарыстоўваюцца і рамантычныя, і дэтэктыўныя, і фантастычныя элементы, што адзначаюць вядомыя беларускія літаратуразнаўцы: «"Скокі смерці" – твор, які сінтэзуе элементы гатычнага, прыгодніцка-дэтэктыўнага, філасофскага раманаў, у якім удала злучаны нацыянальна-гістарычныя (этнанацыянальная самаіндэнтыфікацыя беларусаў, захаванне гістарычнай памяці) і так званыя вечныя праблемы (пачуццё і доўг, вернасць)» [4, с. 150].

*Паралельны раман* – буйны празаічны твор, пабудаваны на рытмічным чарграванні некалькіх часавых вымярэнняў (мінулага і сучаснасці). Л. Рублеўская з дапамогай выкарыстання міфалагем імкнецца выявіць вытокі нацыянальнай ментальнасці, якая дазваляе беларусам «людзьмі звацца», уводзіць паняцце «міфалагічны час» (памяць, містыка снабачанняў, народнае разуменне свету і іншасвету). Паралельны хра-

Рэпазіторый БДПУ

натоп рамана як адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі «сівой даўніны» і паказчык паспяховасці аўтарскай стратэгіі пісьменніцы актуалізуе мінулае і сучаснасць: гістарычны час не дае спакою людзям, хавае шмат таямніц, якія чакаюць свайго адкрыцця; час галоўнай гераіні ў сваю чаргу пераплятаецца з часам паўстання Кастуся Каліноўскага.

*Раман-лабірынт* – вялікі па памеры сюжэтна разгалінаваны твор, заснаваны на выкарыстанні постмадэрнісцкай паэтыкі, героі і падзеі якога знаходзяцца ў перапляценні розных часоў, эпох і іншасвету. Раман «Сутарэнні Ромула» прысвечаны асэнсаванню тэмы сталінскіх рэпрэсій, цікавасць да мастацкай рэканструкцыі якой у Л. Рублеўскай «разгортваецца ў паўнавартаснае мастацкае даследаванне. Яго плёнам становіцца мастацкая гісторыя выжывання самой нацыянальнай ідэі і беларушчыны як яе “ўрэчаўленне” падчас рэпрэсій 1920–1930-х гадоў» [5, с. 1079]. Жанравыя прыкметы рамана «метафарычна ўказаны ў назве. Сутарэнні – лёхі, падзямеллі, найперш заблытаныя лініі чалавечых лёсаў і чалавечай свядомасці, схаваныя пад напластаваннямі часу і абставін» [4, с. 152]. Гэта «раманлабірынт, тэкст-сутарэнні, адметнасць жанравай структуры якога не вытлумачаецца праз “калажавае” счапленне разнастайных элементаў. У дадзеным выпадку мы маем справу з міжжанравай раманнай поліформай. У адрозненне ад “паралельных” хранатопаў папярэдніх твораў Л. Рублеўскай, у “Сутарэннях Ромула” розныя часавыя пласты (XV і XVI стагоддзі, пачатак XIX, першая палова XX (1919 год, канец 1920-х – 1930-я гады, другая палова 1940-х), пачатак XXI стагоддзя) не чаргуюцца па прынцыпе “чарапіцы”, а як бы зрошчваюцца ў нераўнавеснае цэлае, прарастаюць адно ў адным – і “высвечваюцца” адно праз аднаго» [5, с. 1080]. Адзначым, што менавіта ключавымі паняццямі і сімваламі постмадэрнізму з’яўляюцца калажвасць, кліпавасць сатварэння неарэчаіснасці; сімвал лабірынта; сумяшчэнне розных часавых «платформ» / светаў; гульня. Асноўным мастацкім прынцыпам архітэктонікі рамана становіцца «шматсвецце» («многомирие»), падобна булгакаўскаму ў «Майстры і Маргарыце» з адным выключэннем: у класічным рускім творы падаюцца тры вымярэнні, а ў нашым іх значна болей.

*Раман-інструкцыя* – буйны празаічны твор-«квест», гульня, траекторыю якой можа выбіраць сам чытач. У рамане-інструкцыі / рамане-гульні Л. Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію» таксама закранаецца трагічная для нашай гісторыі тэма сталінскіх рэпрэсій. Для вырашэння сваёй звышзадачы – даследаваць прычыны вынішчэння «кода беларушчыны» – Л. Рублеўская ўдала і плённа спалучае ў межах аднаго твора адзнакі і прыкметы розных жанраў: «гатычнага» рамана, фантастыкі і фэнтэзі, дэтэктыва, меладрамы, квеста, кінарамана, твора пра альтэрнатыўную гісторыю. Такім чынам, наватарства пісьменніцы выявілася ў жанравай адметнасці твора, які з’яўляецца раманам-інструкцыяй ці «квестам», што складаецца з «канструктару-набору» нумараваных элементаў: «Уводзіны», «Удзельнік...» (5 гульцоў), «Абсталяванне для гульні», «Гульня» (6 «версій гісторый»), «Паза гульнёй» (8 «фрагментаў»), «Фінальная гульня» (2 «версіі-гісторыі»), «Эпілог» (6 «камбінацый»). Калі твор быў размешчаны ў інтэрнэце («Родныя вобразы» [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http: // rv-blr.com/litaratura/view/2143), чытач мог, карыстаючыся гіперспасылкамі, сам выбіраць пэўную версію гісторыі і развязкі твора, ствараць сваю альтэрнатыўную гісторыю.

*Дэкадансны раман* – вялікі празаічны твор пра мінулае, пабудаваны «на антытэзах. Яго канцэптуальнай ідэяй стала сцвярджэнне вычарпанасці часу, магчымасцей што-небудзь змяніць у лепшы бок, а таму бесперспектыўнасці чалавечага існавання» [4, с. 156]. У дэкадансным рамане гісторыя паўстае белетрызаванай, нагадвае трылер, які разгортваецца як дыхтоўны экшан: знаходжанне ў XXI стагоддзі ў «крутой кватэрцы» на галоўным Мінскім праспекце таемнага дзённіка, што пачынаецца з жудасных слоў: «3.10.1893. Я не люблю фатаграфаваць мёртвых дзяцей» [6, с. 23]; дзённік-аповед Багуславы Каленчыц пра каханне, выпрабаванні, пакуты, рэвалюцыйную барацьбу напрыканцы XIX ст., куды ўплятаецца містычная гісторыя пра лікантропа; «Патаемная кніга» – тэстамент Радаслава Каганецкага. На карысць «дэкаданснай» скіраванасці жанру сведчаць наступныя фактары: папершае, час дзеяння рамана «ўкладаецца ў храналагічныя межы дэкадансу»; па-другое, вобраз смерці (небыцця, энтрапіі) становіцца

адным з галоўных лейтматываў у творы беларускай пісьменніцы; па-трэцяе, хваробы літаральна праследуюць герояў, прыводзяць да выраджэння (локіс, як у П. Мерымэ, эпілепсія, сухоты і інш.); па-чацвёртае, гатычная, змрочная, дэпрэсіўная атмасфера, на фоне якой адбываецца дзеянне; па-пятае, эстэтызм, уменне бачыць прыгажосць нават у натуралістычным; па-шостае, выкарыстанне вобразаў-сімвалаў лабірынта, спалучэнне рэальнага і фантастычнага і інш.

*Раман-фанфік* (твор, напісаны па матывах знакавых ці папулярных твораў мастацтва) – поліжанравая раманная структура, у якой спалучаюцца масавая культура з раскрыццём важкіх філасофскіх тэм, а героі з'яўляюцца адначасна і героямі сваіх твораў, і рэальнымі персанажамі. Змест і сюжэт рамана – дастаткова непрывычныя для нашай літаратуры: галоўная гераіня – мадэратар сайта фанфікаў «Пад знакам Урабораса» імкнецца раскрыць таямніцу, якая звязвае яе з аўтарам фанфікаў. Безумоўна, у чытачоў пакалення Next гэты факт выкліча цікавасць, аднак назва сайта зусім няпростая, яна ўяўляе сабой рэмінісцэнтную з'яву: «Ураборас – змяя, што згарнулася ў пярсцёнак і кусае сябе за хвост, Ураборас сімвалізуе цыклічнасць быцця, рэпрэзентуе вечнасць і бясконцасць праз разбурэнне і стварэнне, праз жыццё і смерць. Назва сайта акцэнтуе множнасць варыянтаў лёсу аўтараў-пачаткоўцаў, а ў межах сюжэтнага ланцуга – абсалютна нечаканыя павароты чалавечых лёсаў» [7]. Незвычайнай з'яўляецца і гісторыя нараджэння Вірынеі: яе «стварыў» Grjaznyj ubljudok, аўтар фанфіка са знакавай назвай амаль як у Джааны Роўлінг «Ордэн захавальнікаў» (сімвал пакаленняў – «ваеннае, партызанскае, гулагаўскае, што выжылі і засталіся людзьмі» [8, с. 97]), таленавіты доктар, які здолеў захаваць маладосць дзякуючы старадаўнім рэцэптам продкаў і перадаў дзяўчыне генетычны код каханай жонкі, якую страціў. Нягледзячы на падобны дастаткова фантастычна-меладраматычны прыём, праблематыка «Пантофлі Мнемазіны» надзвычай сур'ёзная і значная, пісьменніца чарговы раз звяртаецца да асэнсавання драматычных калізій 1930-х гадоў.

*Прыгодніцка-фантасмагарычны раман* – сінкрэтычны ў жанравых адносінах буйны празаічны твор, што спалучае ў сабе адзнакі авантурнага (прыгодніцкага) і фантастычнага жанраў пры дамінанце першага, фантастыка ўводзіцца ў аповед фрагментарна з дапамогай апісання незвычайных падзей, выпадкаў ці вобразаў. Падобныя творы Л. Рублеўскай карыстаюцца надзвычайнай папулярнасцю ў чытачоў розных узроставых катэгорый, пры гэтым адрозніваюцца ад папярэдніх не толькі адсутнасцю паралельнага хранатопу, але і аўтарскай спецыфікай раскрыцця гістарычнай тэмы ў бок большай белетрызацыі і рамантызацыі.

Варта адзначыць, што творы Л. Рублеўскай з цяжкасцю паддаюцца строгай класіфікацыі, яны спалучаюць адзнакі розных жанраў, да прыкладу, гатычны раман «Скокі смерці» – сінкрэтычны, заснаваны на творчым выкарыстанні элементаў гатычнага рамана, дэтэктыва, меладрамы і трылера. Сказанае з поўным правам можна дастасаваць да кожнага твора пісьменніцы.

На нашу думку, вызначальнымі жанрава-тэматычнымі адметнасцямі прозы пісьменніцы з'яўляюцца: белетрызацыя гісторыі; зварот да рэальных гістарычных асоб і падзей; жанравая дыфузійнасць; «урэчаўленне беларушчыны»; наяўнасць некалькіх часавых вымярэнняў (паралельны ці шматслойны хранатоп); дынамічны сюжэт, наяўнасць сенсацыйных фактаў; канфлікт, у якім абавязкова перамагае дабро; феміністычны падыход пры стварэнні вобразаў галоўных гераінь; высокая філалагічная культура стылю; міфалагізацыя і рамантызацыя мінуўшчыны; любоўная інтрыга як адна з сюжэтных ліній; рэцэпцыя язычніцкай, антычнай і біблейская сімволікі; скіраванасць да выкарыстання прынцыпаў постмадэрнісцкай паэтыкі і інтэртэкстуальнасці.


Літаратура

1. *Шаўлякова-Барзенка, І. Л.* Проза / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. ; НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 8–35

References

1. *Shaulyakova-Barzenka, I. L.* Proza / I. L. Shaulyakova-Barzenka // Gistoryya bela-ruskay litaratury XX stagoddzya : u 4 t. ; NAN Belarusi, Addz-ne gumanitar. navuk i mastatstvau, Tsentr dasled. Belarus. kultury, movy i lit. ; navuk. red. U. V. Gnilamyodau, S. S. Laushuk. – 2-ye vyd.– Minsk, 2015. – T. 4, kn. 3. – S. 8–35.


Рэпазіторый БДПУ

2. *Рублеўская, Л.* Сэрца мармуровага анёла : аповесці, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 288 с.
3. *Рублеўская, Л.* Дзеці гамункулуса : аповесць / Л. Рублеўская // Полымя. – 2000. – № 7. – С. 20–65.
4. *Бароўка, В. Ю.* Раманы Людмілы Рублеўскай як мастацкі дыялог з жанравай традыцыяй / В. Ю. Бароўка // Białorutenistyka Białostocka. – Том 7. – Białostock. – 2015. – С. 147–160.
5. *Шаўлякова-Барзенка, І. Л.* Рублеўская Людміла / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. ; НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр дослед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 1062–1084.
6. *Рублеўская, Л.* Дагератып : дэкадансны раман / Л. Рублеўская. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 246 с.
7. *Бароўка, В. Ю.* Апавядальніцкія стратэгіі ў рамане «Пантофля Мнемазіны» Л. Рублеўскай [Электронны рэсурс] / В. Ю. Бароўка. – Рэжым доступу: http://lir-book.by/апавядальніцкія-стратэгіі-ў-рамане. – Дата доступу: 24.03.2018.
8. *Рублеўская, Л.* Пантофля Мнемазіны : раман / Л. Рублеўская. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – 244 с.

2. *Rubleuskaya, L.* Sertsa marmurovaga anyola : apovestsi, apavyadanni / L. Rubleuskaya. – Minsk : Mast. lit., 2003. – 288 s.
3. *Rubleuskaya, L.* Dzetsi gamunkulusa : apovests / L. Rubleuskaya // Polymya. – 2000. – № 7. – S. 20–65.
4. *Barouka, V. Yu.* Ramany Lyudmily Rubleuskay yak mastatski dyyalog z zhanravay tradytsyyay / V. Yu. Barouka // Białorutenistyka Białostocka. – Tom 7. – Białostock. – 2015. – S. 147–160.
5. *Shaulyakova-Barzenka, I. L.* Rubleuskaya Lyudmila / I. L. Shaulyakova-Barzenka // Gistoryya belaruskay litaratury XX stagoddzya : u 4 t. ; NAN Belarusi, Addz-ne gumanitar. navuk i mastatstvau, Tsentr dasled. Belarus. kultury, movy i lit. ; navuk. red. U. V. Gnilamyodau, S. S. Laushuk. – 2-ye vyd. – Minsk, 2015. – T. 4, kn. 3. – S. 1062–1084.
6. *Rubleuskaya, L.* Dageratyp : dekadansny raman / L. Rubleuskaya. – Minsk : A. M. Yanushkevich, 2017. – 246 s.
7. *Barouka, V. Yu.* Apavyadalnitskiya strategii u ramane “Pantoflya Mnemaziny” L. Rubleuskay [Elektronny resurs] / V. Yu. Barouka. – Rezhym dostupu: http://lir-book.by/ apavyadalnitskiya-strategii-u-ramane. – Data dostupu: 24.03.2018.
8. *Rubleuskaya, L.* Pantoflya Mnemaziny : raman / L. Rubleuskaya. – Minsk : A. M. Yanushkevich, 2018. – 244 s.


Репозиторий БГПУ